ПАЛАЖЭННЕ аб парадку
правядзення конкурсу на лепшы
дзіцячы малюнак на экалагічную тэматыку

1. Дадзенае Палажэнне вызначае ўмовы і парадак правядзення конкурсу на лепшы дзіцячы малюнак на экалагічную тэматыку (далей - конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах экалагічнага выхавання, павышэння пісьменнасці, фарміравання актыўнай пазіцыі падрастаючага пакалення ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага прыродакарыстання, далучэнне яго да вырашэння экалагічных праблем.

3. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу ажыццяўляецца Брэсцкім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя (далей - абласны камітэт).

4. Конкурс праводзіцца штогод. На конкурс прадстаўляюцца малюнкі, выкананыя ў любой тэхніцы, уключаючы аплікацыю, якія характарызуюць беражлівыя адносіны да прыроды, захаванне біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці, ахову навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў.

5. У конкурсе могуць прымаць удзел выхаванцы дашкольных установў, навучэнцы агульнаадукацыйных устаноў устаноў дадатковай адукацыі ў дзвюх узроставых групах: ад 3 да 5 гадоў; ад 6 да 10 гадоў. і

6. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца работы, выкананыя на працягу года, у якім праводзіцца конкурс, у адпаведнасці з пунктамі 7, 8 гэтага Палажэння.

7. Кожная работа, якая прадстаўляецца на конкурс, суправаджаецца інфармацыйным лістом удзельніка конкурсу з указаннем наймення ўстановы адукацыі, прозвішча, уласнага імя і ўзросту аўтара, паштовага адраса і кантактнага тэлефона.

8. Работы прадстаўляюцца ў каляровым варыянце на лістах фарматам ад А4 да А1.

9. Асобы, якія вырашылі прыняць удзел у конкурсе, у тэрмін да 1 сакавіка 2020 года, накіроўваюць свае работы ў раённую, гарадскую і раённую, інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя з паметкай "На рэспубліканскі конкурс на лепшы дзіцячы малюнак на экалагічную тэматыку".

10. Конкурс праводзіцца з 1 лютага па 1 мая ў тры этапы: першы этап (1 лютага - 1 сакавіка) - вызначаюцца лепшыя работы на раённым і гарадскім узроўні; другі этап (2 сакавіка - 1 красавіка) - вызначаюцца найлепшыя работы на абласным узроўні; трэці этап (2 красавіка - 1 мая) - вызначаюцца найлепшыя работы на рэспубліканскім узроўні.

11. Для арганізацыі, правядзення і падвядзення вынікаў першага і другога этапаў конкурсу ствараюцца абласны, раённыя, гарадскія і раённыя арганізацыйныя камітэты.

12. У склад арганізацыйнага камітэта могуць уключацца з іх згоды прадстаўнікі ўпраўленняў (аддзелаў) адукацыі, ідэалагічнай работы, культуры мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, інфармацыі. прадстаўнікі сродкаў масавай

13. Персанальны склад абласнога арганізацыйнага камітэта зацвярджаецца загадам абласнога камітэта.

14. Пры разглядзе работ, прадстаўленых на конкурс, членамі арганізацыйнага камітэта ўлічваецца паўната раскрыцця тэмы намінацыі, колькасць работ, выхаваўчая і грамадская каштоўнасць, яркасць і арыгінальнасць падачы матэрыялу.

15. Пераможцы ў кожнай узроставай групе вызначаюцца па найбольшай суме балаў, выстаўленых кожным членам арганізацыйнага камітэта ў адносінах да асобнага ўдзельніка конкурсу па дзесяцібальнай сістэме.

16. У выпадку адбору некалькіх работ аднаго аўтара ўзнагароджваецца толькі адна з іх, якая атрымала найбольшую колькасць балаў.

17. Пасяджэнне арганізацыйнага камітэта лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічае не менш як 2/3 складу камітэта.

18. Рашэнне арганізацыйнага камітэта прымаецца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў членаў арганізацыйнага камітэта. Пры роўным размеркаванні галасоў прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня арганізацыйнага камітэта. Рашэнне арганізацыйнага камітэта афармляецца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі арганізацыйнага камітэта. Калі член арганізацыйнага камітэта мае заўвагу па прынятым рашэнні або не згодзен з ім, то ён мае права выкласці ў пісьмовай форме сваё асаблівае меркаванне, якое прыкладаецца да пратакола пасяджэння арганізацыйнага камітэта.

19. Па выніках першага этапа конкурсу раённыя, гарадскія і раённыя арганізацыйныя камітэты вызначаюць пераможцаў і накіроўваюць у абласны арганізацыйны камітэт работы, якія занялі першае, другое і трэцяе месцы.

20. Абласны арганізацыйны камітэт вызначае пераможцаў і накіроўвае ў рэспубліканскі арганізацыйны камітэт работы, якія занялі першае, другое і трэцяе месцы на другім этапе.

21. Падвядзенне вынікаў конкурсу ажыццяўляецца рэспубліканскім арганізацыйным камітэтам з вызначэннем першага, другога і трэцяга месца ў кожнай узроставай групе.

22. Работы, якія не перамаглі ў конкурсе, вяртаюцца арганізацыйным камітэтам яго ўдзельніку.

23. Узнагароджанне пераможцаў першага і другога этапа конкурсу праводзіць - абласны арганізацыйны камітэт, трэцяга - рэспубліканскі арганізацыйны камітэт.

24. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі. ва ўрачыстай абстаноўцы